НОВЫЯ СУСТРЭЧЫ З ЛЮБІМЫМІ 5

КАЛІ МІНУЛА БУРА... 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+ТВ ПРАГРАМА

19 ЛІПЕНЯ 2024 г. ПЯТНІЦА № 139 (30273)

## КАРАТКА

- **Беларусь і Кітай створаць рабочую групу па інвестыцыйным супрацоўніцтве.**
- Ва ўборачнай кампаніі задзейнічаюць больш за 120 тыс. машын і абсталявання, у тым ліку 7,4 тыс. збожжаўборачных камбайнаў, больш за 8 тыс. машын для адвозкі збожжа, амаль 2 тыс. збожжаўборачных комплексаў для дапрацоўкі збожжа, а таксама іншую тэхніку.
- **Беларусь і Куба заключылі два крэдытныя пагадненні на суму больш за 2 млн еўра для разлікаў за пастаўку сухога малака.**
- Футбольная зборная Беларусі апусцілася на адну пазіцыю ў абноўленым сёння рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі футбола (ФІФА).

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук:**

*«Інстытут прэзідэнцкай улады трывала ўвайшоў у палітычную сістэму нашай краіны, стаў найважнейшай часткай беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай бяспекі. Нам ёсць чым ганарыцца, а беларусам ёсць што сказаць аб дасягненнях апошняга трыццацігоддзя. Яны відавочныя ва ўсім. Для таго, каб краіна выйшла на новы ўзровень развіцця, трэба было прыкласці тытанічныя намаганні: згуртаваць народ, нацэліць на стварэнне, на прадукцыйную працу, запусціць прадпрыемствы. Гэта вялізныя і неймаверныя намаганні. Толькі той, хто жыў трыццаць гадоў назад, сёння можа параўноўваць і даваць сапраўды аб'ектыўную ацэнку».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ВАЖНА ПРАЯЎЛЯЦЬ ІНІЦЫЯТЫЎНАСЦЬ, БЫЦЬ НА ВАСТРЫІ ПАДЗЕЙ, ПРАЦАВАЦЬ НА АПЕРАДЖЭННЕ»

## Якія задачы Прэзідэнт паставіў перад Канстытуцыйным Судом

**Прэзідэнт Беларусі Аляксадр Лукашэнка сустрэўся з суддзямі Канстутыцыйнага Суда. Кажучы пра мэту сустрэчы, ён нагадаў, што на папярэдняй сустрэчы шэсць гадоў таму, асноўнай тэмай размовы была падрыхтоўка змяненняў у Канстытуцыю. За гэтыя гады праведзена вялікая работа па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Асноўны закон краіны. Як заўважыў кіраўнік дзяржавы, свой уклад у яе яе ўнеслі і суддзі Канстытуцыйнага Суда.**

Фота БелТА.

«Наступныя падзеі пацвердзілі своечасовасць прынятых змен. Але галоўнае — усе закладзеныя ў Канстытуцыі прынцыпы і нормы павінны працаваць на практыцы. Гэта самае галоўнае», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым ён назваў недахопам і праблемай выпадкі, калі прынятыя нарматыўна-прававыя акты на практыцы не працуюць. «Гэта датычыцца і паўнамоцтваў Канстытуцыйнага Суда. У ходзе канстытуцыйнай рэформы яны значна пашыраны, у тым ліку з улікам вашых прапаноў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

### «Ад вашай актыўнасці залежыць абарона канстытуцыйнага правапарадку»

«Лічу, што ў пытаннях рэалізацыі палажэнняў Асноўнага Закона Канстытуцыйнаму Суду неабходна займаць шчыра, не баючыся, лідарскую пазіцыю. Цяпер важна праяўляць ініцыятыўнасць, быць на вастрыі падзей, працаваць на апярэджанне. Словам, грамадства павінна бачыць Канстытуцыйны Суд у справе. Ад гэтай вашай актыўнасці залежыць дзейснасць абароны канстытуцыйнага правапарадку ў нашай краіне», — сказаў Прэзідэнт. У сувязі з гэтым ён прапанаваў абмеркаваць шэраг актуальных пытанняў дзейнасці Канстытуцыйнага Суда.

**Першае.** Новай канстытуцыйнай функцыяй Суда стала тлумачэнне Асноўнага Закона. Для гэтага патрабуецца ініцыятыва прававмоцных дзяржаўных органаў (Прэзідыум УНС, палаты Парламента, Вярхоўны Суд, Урад). Гэтыя органы таксама маюць права звяртацца па пытанні адпаведнасці Канстытуцыі нарматыўных прававых актаў. «Пакуль мы не бачым такой ініцыятывы. Але глебу для рэалізацыі такіх паўнамоцтваў павінен рыхтаваць і сам Суд. Вы павінны праініцыіраваць гэты працэс праз сваю практычную дзейнасць», — заўважыў беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў сваю чаргу для дзяржаўных органаў гэтыя канстытуцыйныя нормы не павінны быць дэкларатыўнымі. «Да вас звяртаюцца людзі з набалелымі пытаннямі», — звярнуў ён увагу.

**Другое.** У Асноўным Законе з'явілася яшчэ адна важная навацыя — інстытут канстытуцыйнай скаргі. Прэзідэнт нагадаў, што гэта ініцыятыва самога Суда. Грамадзяне атрымалі магчымасць звароту ў Канстытуцыйны Суд не толькі праз упаўнаважаныя дзяржаўныя органы, але і асабіста. «Вы павінны даступна расказваць людзям, што канстытуцыйная скарга — гэта іх дадатковая гарантыя, калі вычарпаны ўсе сродкі абароны ў судах агульнай юрысдыкцыі. І калі мы ўвялі прамы доступ да канстытуцыйнага правасуддзя, лічу недапушчальным фармальны разгляд канстытуцыйных скаргаў грамадзян», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**Трэцяе.** Прэзідэнт звярнуў увагу на ўзаемадзеянне судоў. Звяртацца ў Канстытуцыйны Суд маюць права і суды агульнай юрысдыкцыі. Пры разглядзе канкрэтнай справы суддзя, усумніўшыся ў канстытуцыйнасці прымяняемага ў гэтай справе акта, ставіць пытанне аб праверцы яго на прадмет адпаведнасці Канстытуцыі. «Ні да ўнясення змяненняў у Асноўны Закон, ні пасля ніводнага запыту ў Канстытуцыйны Суд не паступала. Пытанне: у чым праблема? Ведаю, што на гэты конт у Вярхоўнага Суда ёсць сваё меркаванне», — адзначыў беларускі лідар.

СТАР. 2

Жніво

# УРАДЖАЙ НА ПОЛІ. ЯГО ТРЭБА САБРАЦЬ БЕЗ СТРАТ

**Начальнік Галоўнага ўпраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Мікалай ЛЕШЫК лічыць, што сёлета ў Беларусі сфарміраваўся даволі нядрэнны ўраджай і былі прыняты ўсе неабходныя меры для яго фарміравання. «Прыярытэт у восеньскай сяўбе мінулага года быў аддадзены сельскагаспадарчым раслінам, якія даюць больш высокі ўраджай. У першую чаргу гэта азімы ячмень. Своечасова праведзены ўсе работы па догляду за раслінамі. Убраць з палёў нам трэба будзе больш за 2 мільёны гектараў збожжавых каласавых і зернебабовых культур без кукурузы, грэчкі і проса. Гэтыя расліны прыбіраем непасрэдна ў ліпені і завершым іх уборку ў жніўні», — адзначыў Мікалай Лешык.** СТАР. 3

Фота БелТА.

Моцны слабы пол

# АЎТАІНСТРУКТАР НА АБЦАСАХ

## Магіляўчанка Вольга Кашанкова пра тое, як можна сумяшчаць жаноцкасць і «не жаночую» справу

**Сёння нікога жанчынай за рулём не здзівіш, але Вольга Кашанкова была адной з першых у Магілёве жанчынай-аўтаінструктарам, таксістам і нават кіроўцам міжгародняй маршруткі. Напэўна, спрацавалі бацькоўскія гены, смяецца яна. І расказвае гісторыю, як яе маці ў дзявоцтве любіла садзіцца за руль «Жыгулей», на якіх яе тата прыязджаў абедаць дамоў. Далей справа не пайшла, вадзіцелем яна так і не стала. Затое праз некалькі дзясяткаў гадоў яе мары ажыццявіла дачка.** СТАР. 4

# «БЫЦЬ НА ВАСТРЫІ ПАДЗЕЙ, ПРАЦАВАЦЬ НА АПЕРАДЖЭННЕ»

## «Вы — частка нашай дзяржавы»

Пераходзячы да абмеркавання пытанняў, Прэзідэнт падкрэсліў, што вышэйшы орган канстытуцыйнага кантролю не павінен быць староннім назіральнікам за працэсамі, якія адбываюцца ў грамадстве. «Пры гэтым хачу папярэдзіць, што Канстутыцыйны Суд не павінен сябе пазіцыянаваць як нешта выключнае ў нашай дзяржаве», — канстатаваў ён. Аляксандр Лукашэнка прывёў у прыклад Злучаныя Штаты Амерыкі. «Вы бачыце, як ўлада сябе паводзіць, чаго варта гэта «дэмакратыя». І, напэўна, станоўчы факт — вы бачыце, як гэтая магутная краіна, якой, напэўна, і не трэба паказваць свой спрыт, абараняе дзяржаўныя інтарэсы. І плаваць ім на ўвесь свет — «Амерыка вышэй за ўсё». Таму не забывайце. Напэўна, ні адна дзяржава не зрабіла столькі, як мы, у адносінах да незалежнасці нашых судоў. Але вы не павінны забываць аб тым, што вы частка нашай дзяржавы, дзяржаўнай структуры, калі хочаце, апарата кіравання. Аб гэтым ні ў якім разе нельга забываць. Мы павінны быць як ніколі адзіныя, для таго, каб выстаяць і каб захаваць сваю дзяржаву. Вы не горш за мяне разумееце, што адбываецца».

Кіраўнік дзяржавы зрабіў акцэнт на тым, што Канстытуцыйнаму Суду нельга абасабляцца. «Неабходна выбудоўваць канструктыўнае ўзаемадзеянне з іншымі дзяржаўнымі органамі. Ваша роля павінна быць бачная і ў правапрымяняльнай дзейнасці», — паставіў задачу Прэзідэнт. І растлумачыў, у чым іх сутнасць. На сёння дзеючымі з'яўляюцца 175 тысяч прававых актаў! Кіраўнік дзяржавы назваў гэта катастрофай. Некаторыя з іх цяжка чытальныя і ўспрымальныя, перагружаныя, асобныя пытанні зарэгуляваны, некаторыя нормы паўтараюцца. У акты ўносяцца шматлікія карэкціроўкі. «Я вельмі часта патрабую, каб, калі мы ўносім нейкія істотныя карэкціроўкі, выкладаць гэты нарматыўна-прававы акт нанова з улікам змяненняў, каб лягчэй было працаваць», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. Таму Адміністрацыі Прэзідэнта дадзена даручэнне арганізаваць правядзенне маштабнай рэвізіі заканадаўства. «Нам трэба ўсё гэта пераварушыць, нам трэба прыбраць усё лішняе. Трэба пакінуць толькі тое, што патрэбна. Трэба правесці гэтую рэвізію. Гэта будзе «рэвалюцыя» не толькі ў нарматворчай дзейнасці, гэта будзе «рэвалюцыя» ў краіне. Усё павінна быць зразумела, даступна. Я перакананы, што мы напалову колькасць гэтых кніжак і гэтых актаў скароцім», — паставіў задачу Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што гэта, ў тым ліку, і вялікая работа парламентарыяў, як верхняй, так і ніжняй палаты. Па словах кіраўніка дзяржавы, працаваць будуць усе — ад простага юрыста да Прэзідэнта: «Мэта такой рэвізіі — скарачэнне прававога масіву, устараненне супярэчнасцяў у прававым рэгуляванні, выяўленне падзаконных актаў, якія не адпавядаюць Канстытуцыі, законам і ўказам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Вельмі хацеў бы вас прасіць, каб вы да гэтага падключыліся».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што досвед і веды суддзяў Канстутыцыйнага Суда неабходна выкарыстоўваць і ў адукацыйным сферы. «Я чалавек скупы і ў гэтым плане. І разумею, што ў Канстытуцыйным Судзе самыя прасунутыя нашы юрысты. І думаю, што яны недагружаныя ў тым плане, што шырэй трэба працаваць з грамадствам. Вось гэтага няма ў Канстытуцыйнага Суда, асабліва з маладняком нашым, у ВНУ. Вы цудоўныя лектары, аратары, вы скарбніца ведаў у галіне права. Ды і не толькі права — і ў жыцці вы дарослыя людзі. Таму я бы вельмі хацеў вас бачыць у студэнцкіх аўдыторыях і гэтак далей. Ды і дзяржаўных служачых трэба вучыць», — сказаў ён.

«Карацей, трэба ўставаць у авангард і ісці наперад», — падсумаваў кіраўнік дзяржавы.

## «Вы маеце права на ўсё»

Старшыня Канстытуцыйнага Суда Пётр Міклашэвіч у сваім дакладзе адзначыў, што цяпер паўнамоцтвы Канстытуцыйнага Суда значна пашыраны. Але пры гэтым адной з асаблівасцяў работы Канстытуцыйнага Суда ён назваў той факт, што гэта па прыродзе пасіўны орган. Канстытуцыйны Суд не мае права па сваёй ініцыятыве ўзбуджаць канстытуцыйнае судаводства. Ініцыіраванне канстытуцыйнага кантролю ажыццяўляецца іншымі спецыяльна ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі і грамадзянамі.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што Канстытуцыйнаму Суду не абавязкова чакаць ініцыятывы з боку іншых суб'ектаў, яму і самому варта яе праяўляць, калі відавочныя тыя ці іншыя праблемныя пытанні. «Вы маеце права на ўсё. Давайце ад жыцця. Калі вы нешта бачыце, вы ж мне можаце падказаць, адпаведным суб'ектам падказаць. І мы ўнясём такую ??прапанову. Была б неабходнасць у гэтым на карысць дзяржаве», — сказаў Прэзідэнт. «Мы будзем у гэтым плане глядзець. Калі мы ўбачым, то сапраўды будзем прапаноўваць упаўнаважаным дзяржаўным органам унесці адпаведную прапанову», — пагадзіўся Пётр Міклашэвіч.

Старшыня Вярхоўнага Суда падкрэсліў, што сёння можна канстатаваць адсутнасць з боку дзяржаўных органаў актыўнага ініцыіравання канстытуцыйнага кантролю. «Гэта сведчыць, што ў заканадаўчай практыцы і правапрымяненні дзяржаўныя органы паважліва ставяцца да норм і прынцыпаў Канстытуцыі, імкнуцца іх выконваць у практычнай дзейнасці, што забяспечвае стабільны ўзровень канстытуцыйнай законнасці ў краіне, выключэнне прыняцця неканстытуцыйных актаў заканадаўчага характару», — сказаў Пётр Міклашэвіч. З іншага боку, суд чакае звароты ад упаўнаважаных органаў — Прэзідэнта, парламента, урада, Вярхоўнага Суда, прэзідыума УНС, каб Канстытуцыйны Суд мог выказаць сваю пазіцыю аб пераадоленні нявызначанасці ў канстытуцыйна-прававым рэгуляванні ў мэтах абароны і поўнай рэалізацыі канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян.

Пётр Міклашэвіч выказаўся аб рэалізацыі навацыі, якая з'явілася ў абноўленым Асноўным законе — інстытута канстытуцыйнай скаргі. З 1 кастрычніка 2023 года па 28 чэрвеня 2024 года ў Канстытуцыйны Суд паступіла 311 зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб. «Мы зрабілі аналіз працэсуальнага заканадаўства па розных катэгорыях спраў. Гэты перыяд прыкладна ад 8 да 9 месяцаў, каб прайсці і вычарпаць усе сродкі. У Канстытуцыйны Суд паступіла больш за 300 зваротаў. Але пакуль яны не адпавядаюць гэтым крытэрыям. Мы спадзяёмся, што ў бліжэйшы час з улікам усіх установленых крытэрыяў на ўзроўні закона нам паступяць ужо сапраўды належна аформленыя канстытуцыйныя скаргі, і мы будзем іх разглядаць па сутнасці, — сказаў Пётр Міклашэвіч. — Таму пачатковы перыяд рэалізацыі права канстытуцыйнай скаргі паказаў, што гэты прававы інстытут запатрабаваны грамадзянамі для абароны сваіх правоў і свабод». Разам з тым, назіраецца праблема з ініцыіраваннем канстытуцыйнай скаргі непасрэдна грамадзянамі. «Таму відавочна, што ўзровень юрыдычнай дапамогі павінен быць павышаны, у тым ліку з боку адвакацкай супольнасці. Канстытуцыйным Судом прымаюцца пэўныя меры інфармацыйна-тлумачальнага характару, каб канстытуцыйныя скаргі грамадзян паступалі юрыдычна належна аформленымі», — адзначыў старшыня Канстытуцыйнага Суда.

«Калі я правільна разумею, вы прытрымліваецеся той пазіцыі, каб больш у Канстытуцыйны Суд звярталіся і грамадзяне, і суб'екты, аб якіх мы гаварылі?» — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. Пётр Міклашэвіч адзначыў, што сітуацыя тут двухбаковая і растлумачыў, чаму: «З аднаго боку, калі складаная крызісная канстытуцыйна-прававая сітуацыя, тады розныя органы спрачаюцца аб кампетэнцыі, межах паўнамоцтваў. Таму дай бог, каб у нас такіх сітуацый не ўзнікала. Сёння ў нас сапраўды на канстытуцыйнай аснове ўзаемадзейнічаюць усе органы дзяржаўнай улады і Прэзідэнт каардынуе дзейнасць дзяржаўнай сістэмы, — сказаў ён. — З іншага боку, што тычыцца грамадзян, то, вядома, мы не за тое, каб усе абсалютна звярталіся ў Канстытуцыйны Суд. Таму што практыка канстытуцыйных судоў РФ, еўрапейскіх краін паказвае, што толькі каля 4 % ад усіх зваротаў становяцца прадметам разгляду ў Канстытуцыйным Судзе».

**Намеснік старшыні Канстытуцыйнага Суда Наталля КАРПОВІЧ** падкрэсліла, што ў нашай дзяржаве правы і свабоды грамадзян — найвышэйшая каштоўнасць. І Канстытуцыяй грамадзянам дадзены шырокія правы ва ўсіх сферах. У тым ліку грамадзяне маюць права на судовую абарону сваіх правоў. І грамадзяне маюць права звярнуцца ў Канстытуцыйны Суд для абароны сваіх канстытуцыйных правоў. «Галоўны прынцып, закладзены ў нашу Канстытуцыю — гэта прынцып справядлівасці. І як сказаў на сустрэчы кіраўнік дзяржавы — галоўная задача Канстытуцыйнага Суда — гэта зацвярджэнне справядлівасці для грамадзян», — адзначыла Наталля Карповіч. Яна падкрэсліла, што прамы доступ грамадзян да канстытуцыйнага правасуддзя ў нашай гісторыі замацаваны ўпершыню.

**Суддзя Канстытуцыйнага Суда Святлана ЛЮБЕЦКАЯ** заўважыла, што цяперашняя сустрэча з суддзямі — гэта чарговы крок дзяржавы і Прэзідэнта, які ініцыяваў і выбудаваў усю сістэму ўдасканалення Канстытуцыі, на шляху эфектыўнага ўкаранення прынятых навацый. «Задачы, пастаўленыя Прэзідэнтам перад Канстытуцыйным Судом, якраз накіраваны ў практычны бок — каб пачалі дзейнічаць новыя паўнамоцтвы, якія накіраваны на ўзмацненне судовай абароны грамадзян, фарміраванне ў грамадстве ўпэўненасці, што справядлівасць забяспечваецца на справе», — падкрэсліла Святлана Любецкая. Суддзя ўдакладніла, што пры падачы канстытуцыйнай скаргі абавязкова выканаць некалькі патрабаванняў. Першае: чалавек павінен вычарпаць усе спосабы судовай абароны ў судах агульнай юрысдыкцыі аж да нагляднай інстанцыі. Другая ўмова — канстытуцыйная скарга павінна быць звязана з аспрэчваннем закона, які прыменены ў канкрэтнай справе або судовай спрэчцы пасля 1 кастрычніка 2023 года. Трэцяе — у такой скарзе павінны быць дакладна пазначаны падставы, па якіх асоба лічыць, што закон, ужыты ў яго спрэчцы, не адпавядае Канстытуцыі, супярэчыць ёй. Святлана Любецкая растлумачыла, што чалавек, які падае канстытуцыйную скаргу, спрачаецца не з рашэннем суда (Канстытуцыйны суд не перарашае справу нанова замест суда агульнай юрысдыкцыі), а з законам. Просты прыклад: суд агульнай юрысдыкцыі прымае рашэнне аб падзеле маёмасці паміж мужам і жонкай у роўных долях, але адзін з іх падае канстытуцыйную скаргу, лічачы, што закон, які прадугледжвае такі падзел маёмасці, несправядлівы. Канстытуцыйны Суд дасць кампетэнтны адказ, але не зменіць долі мужа і жонкі.

Кіраўнік дзяржавы даў даручэнне Адміністрацыі Прэзідэнта правесці рэвізію заканадаўства. **Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольга ЧУПРЫС** заўважыла, што кіраўніком дзяржавы падчас нарад з Урадам неаднаразова адзначалася наяўнасць праблем у заканадаўстве, абумоўленым празмерна старанай нарматворчасцю. «За 30 гадоў незалежнасці Рэспублікі Беларусь мы вельмі стараліся і напрацавалі вялізны нарматыўна-прававы масіў. Толькі дзейных больш за 175 тысяч нарматыўна-прававых актаў. Прэзідэнт звяртае ўвесь час увагу на гэту праблему, і яму было даложана аб структуры гэтых актаў. 80 працэнтаў — гэта акты ўрада і ведамасныя акты», — сказала Вольга Чупрыс і патлумачыла, што праблема ў тым, што такія дакументы выкарыстоўваюць пераважна кантралёры пры правядзенні праверак. І ў такім вялізным масіве нарматыўна-прававых актаў могуць быць праблемы, звязаныя з дубліраваннем актаў па адной і той жа праблематыцы, па адной тэме можа быць некалькі актаў, неўзгодненых паміж сабой. Пастановы ўрада і ведамстваў па сваім нарматыўным змесце могуць не адпавядаць Указам Прэзідэнта і скажаць сэнс указа або закона. Ёсць мноства нарматыўна-прававых актаў, якія немагчыма прачытаць, не тое што іх усвядоміць. Напрыклад, сустракаюцца акты на 300 старонак, або акты, якія ўключаюць у сябе ад 300 да 500 пунктаў. «Рэвізія заканадаўства вельмі важная. І ў рабоце над ёй павінны паўдзельнічаць усе дзяржаўныя органы, без выключэння. Мне здаецца, і Прэзідэнт гэта падтрымаў, павінны паўдзельнічаць і грамадзяне. Таму на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале будзе адпаведная рубрыка, і мы чакаем прапаноў, заўваг грамадзян па нашым заканадаўстве, каб атрымаць досвед правапрымянення на практыцы ў тым ліку і пры правядзенні рэвізіі», — адзначыла Вольга Чупрыс. Паводле яе слоў, такая рэвізія заканадаўства павінна праходзіць рэгулярна. Плануецца, што па яе выніках колькасць нарматыўна-прававых актаў істотна скароціцца і яны будуць больш зразумелыя і простыя для правапрымянення.

**Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Вадзім ІПАТАЎ** нагадаў журналістам, што, згодна з абноўленай Канстытуцыяй, устаноўлены папярэдні кантроль канстытуцыйнасці законаў толькі па прапановах Прэзідэнта. Раней такі кантроль праходзілі ўсе законы. Ён растлумачыў, чым было выклікана такое рашэнне: «Беларусь за сваю гісторыю незалежнасці прайшла вельмі сур'ёзны шлях пабудовы прававой сістэмы. Сёння мы можам канстатаваць: прававая сістэма выбудавана такім чынам, што ёсць шмат стадый, на якіх рыхтуецца законапраект, суадносіцца з нашым Асноўным законам. Пры падрыхтоўцы абноўленай Канстытуцыі ўсе гэтыя пазіцыі былі дакладна вывераны». Па словах Вадзіма Іпатава, за апошнія гады сістэма прававога кантролю значна ўзрасла і ў палітычным, і ў прафесійным аспектах. За гэты час людзі ўсвядомілі, як неабходна ажыццяўляць узгадненне законапраектаў, як іх падрыхтаваць з пункту гледжання духу і літары Канстытуцыі. «Ёсць юрыдычная экспертыза, крыміналагічная экспертыза. Дзяржаўныя органы ўключаны ў сістэму ўзгаднення ўсіх законапраектаў, якія рыхтуюцца. Калі суб'ект заканадаўчай ініцыятывы накіроўвае ў парламент для разгляду законапраект, парламент атрымлівае ўжо адносна вывераны дакумент, прапрацаваны з усіх пунктаў гледжання, у тым ліку на адпаведнасць Асноўнаму закону. На ўсіх стадыях абмеркавання ў Палаце прадстаўнікоў і Савеце Рэспублікі законапраекты яшчэ раз дасканала аналізуюцца. Гэта з'яўляецца асновай таго, каб Канстытуцыйны Суд не падключаўся літаральна да кожнага закона», — растлумачыў парламентарый. Разам з тым, падкрэсліў ён, механізм праверкі закона на адпаведнасць Канстытуцыі застаецца і зараз: «Ён будзе працаваць і будзе забяспечваць адпаведнасць нашага заканадаўства Асноўнаму закону краіны».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### ❍ У тэму

## Галоўны прынцып — справядлівасць

Размаўляючы з журналістамі, Пётр Міклашэвіч удакладніў, што перадача грамадзянам права непасрэдна звяртацца ў Канстытуцыйны суд — гэта агульнасусветны падыход. Але ісці да яго трэба паступова і паэтапна, як гэта было на постсавецкай прасторы. «Цяпер мы гатовы разглядаць такія звароты. Досвед напрацаваны. Сёння мы ідзем у рэчышчы канстытуцыйнага правасуддзя як на еўрапейскім, так і на сусветным узроўні, — адзначыў ён, заўважыўшы пры гэтым, што важная не колькасць. «Колькасць зваротаў нас не палохае, паколькі ў нас будзе папярэдні аналіз і, адпаведна, з усяго аб'ёму паступаючых скаргаў прадметам разгляду ў Канстытуцыйным Судзе будуць толькі тыя, якія сапраўды патрабуюць выказвання пазіцыі Канстытуцыйнага Суда аб канстытуцыйнасці або неканстытуцыйнасці той ці іншай нормы, таго ці іншага закона, які ўжыты ў канкрэтнай справе», — растлумачыў старшыня Канстытуцыйнага Суда.

Прадастаўленне права звароту грамадзян непасрэдна ў Канстытуцыйны Суд з канстытуцыйнай скаргай Пётр Міклашэвіч назваў пэўным сацыяльным кантролем за заканатворчым працэсам у дзяржаве: грамадзянін ужо аспрэчвае непасрэдна норму закона, ён кажа аб тым, што не правапрымяненне парушыла яго права, а сама норма звузіла або абмежавала яго канстытуцыйныя правы і свабоды. «Гэта складаны, няпросты працэс. Але мы да гэтага гатовы і пачынаем дзейнічаць!», — падсумаваў ён.

# «КАБ ААН БЫЛА БОЛЬШ ЭФЕКТЫЎНАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам Пастаяннага прадстаўніка Рэспублікі Беларусь пры ААН Валянціна Рыбакова. Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, сустрэча актуальная і тым, што на пачатку ліпеня на палях саміту ШАС адбылася яго сустрэча з Антоніу Гутэрышам, генеральным сакратарам ААН.**

«Адбылася такая цікавая размова, цікавая сустрэча, інтэрпрэтавалі яе па-рознаму розныя сродкі масавай інфармацыі, асабліва ў інтэрнэце, накшталт таго, што прэтэнзіі нейкія Гутэрыуш прад'явіў нам», — нагадаў ён. Але, як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, ніякіх прэтэнзій не было: «Наадварот, мы атрымалі станоўчую ацэнку. Але што нам іх ацэнка, мы бачым, што там адбываецца на месцы твайго знаходжання. Мы зараз ацэньваем адпаведным чынам «дэмакратыю» сусветную і гегемона нашага, і іншае. Але гэта іх пытанні».

Прэзідэнт заявіў, што Беларусь як адна з краін-заснавальніц падтрымлівала і будзе падтрымліваць Арганізацыю Аб'яднаных Нацый. Ён прызнаў, што ёсць пэўныя недахопы ў дзейнасці ААН. Але, па словах беларускага лідара, яны тычацца не генеральнага сакратара ААН ці ўсёй арганізацыі ў цэлым. Гэта недахопы ўсіх яе членаў, бо кожны мае свой голас, сваё меркаванне. «Мы гэта цудоўна разумеем. Але будзем працаваць над тым, каб Арганізацыя Аб'яднаных Нацый была больш эфектыўнай арганізацыяй, каб своечасова прымаліся рашэнні, і каб гэтыя рашэнні былі справядлівымі для ўсіх краін пераважнай большасці. Хаця б для краін — удзельніц Арганізацыі Аб'яднаных нацый, а не так, як гэта адбываецца цяпер, дзякуючы той палітыцы, якую праводзіць Захад, перш за ўсё ЗША, карыстаючыся сваёй дамінуючай перавагай у эканоміцы, фінансах і гэтак далей. Таму мы за Арганізацыю Аб'яднаных Нацый, мы будзем падтрымліваць усе талковыя ініцыятывы, якія будуць адпавядаць нашаму разуменню справядлівага светаўладкавання — шматпалярнасці ў свеце і гэтак далей. У гэтым напрамку будзем дзейнічаць. І нашы людскія ініцыятывы ні ў якім разе не набываюць меншую значнасць для сусветнай супольнасці, наадварот, значныя. Мы таксама будзем прытрымлівацца іх і іншых пытанняў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Беларускі лідар пацікавіўся ў Валянціна Рыбакова поглядам на сітуацыю ў ЗША, сітуацыяй у ААН. Ён запытаў, якія намаганні варта прыкласці, каб голас Беларусі ў ААН быў больш значным.

У сваю чаргу Валянцін Рыбакоў падкрэсліў, што пры ўсёй вялікай значнасці ўдзелу Беларусі ва ўсіх інтэграцыйных структурах на розных міжнародных пляцоўках, ААН з'яўляецца адзінай ўніверсальнай міжнароднай арганізацыяй, дзе прадстаўлены ўсе дзяржавы свету. «Для нас гэта вялізная магчымасць, якой мы актыўна карыстаемся, каб данесці нашу пазіцыю, каб голас Беларусі быў чутны па ўсіх пытаннях, якія ўяўляюць прыярытэтную цікавасць для нас», — сказаў ён.

## ❍ У тэму

### У ААН мы працуем з усімі краінамі

У размове з журналістамі Валянцін Рыбакоў падкрэсліў значнасць ААН у якасці ўніверсальнай міжнароднай арганізацыі, дзе прадстаўлены ўсе дзяржавы свету. «Гэта дае нам магчымасць працаваць фактычна з усімі краінамі, спрабаваць данесці нашу пазіцыю па прыярытэтных для Беларусі пытаннях», — сказаў ён. Пастаянны прадстаўнік Беларусі ў ААН расказаў, што зараз шмат часу надаецца рабоце, накіраванай на супрацьдзеянне незаконным аднабаковым санкцыям. «Пры гэтым трэба дакладна разумець, што мы не можам і не зможам ніколі і не павінны патрабаваць ад ААН зняць санкцыі. Гэта не аанаўскія санкцыі. Яны таму і называюцца аднабаковымі прымусовымі мерамі. Гэта меры, якія прыняты або канкрэтнай дзяржавай, або групай дзяржаў. Гэта не міжнародныя санкцыі», — растлумачыў ён. Валянцін Рыбакоў дадаў, што санкцыі называюць незаконнымі, паколькі яны груба парушаюць міжнароднае права, Статут ААН, усе магчымыя правы чалавека. «Законнымі санкцыямі з'яўляюцца толькі тыя, якія прыняты па рашэнні Савета Бяспекі ААН. Кропка. Усе астатнія санкцыі з'яўляюцца незаконнымі», — растлумачыў дыпламат. У сувязі з гэтым сэнс работы ў ААН па антысанкцыйнай тэматыцы заключаецца ў тым, каб даводзіць да міжнароднай супольнасці найцяжэйшыя наступствы ўвядзення такіх санкцый. Прычым часта гэтыя наступствы аказваюцца найбольш адчувальнымі не столькі для Беларусі, колькі для іншых дзяржаў. Асабліва, калі санкцыі тычацца экспарту калійных угнаенняў і з улікам маштабаў недаядання і голаду на планеце, у першую чаргу ў краінах Глабальнага Поўдня. Валянцін Рыбакоў падкрэсліў, што маштаб і наступствы гэтых забарон адчуваюцца ўсюды, і гэта разумеюць партнёры з заходніх дзяржаў.

Таксама беларускія дыпламаты на палях ААН прасоўваюць пытанні, звязаныя з подзвігам савецкага і беларускага народаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, процідзеяннем спробам гераізацыі нацызму і праявам неанацызму, абаронай традыцыйных сямейных каштоўнасцяў. Гэта таксама дасягненне на нацыянальным узроўні Мэт устойлівага развіцця.»Нам тут ёсць чым ганарыцца, нам ёсць што расказваць міжнароднай грамадскасці. Мы дзелімся вопытам, гаворым аб сваіх дасягненнях. Прызнаём, што асобныя мэты не выконваюцца. У першую чаргу гэта звязана з наступствамі санкцыйнага націску», — адзначыў Валянцін Рыбакоў. Ён падкрэсліў, што ў пастпрадстаўніцтве Беларусі наладжаны цудоўныя дзелавыя і асабістыя адносіны з кіраўніцтвам і персаналам пастаянных прадстаўніцтваў многіх дзяржаў. Падтрымліваюцца кантакты і з дыпламатамі з краін Захаду, у тым ліку з краінай знаходжання — ЗША. «Не абавязкова гэты дыялог носіць адкрыты характар, але ён нікуды не падзеўся і ніколі не спыняўся», — запэўніў дыпламат.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «УСЕ ПРАБЛЕМЫ, АСАБЛІВА ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА, ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗНЯТЫ»

**Раніцай 18 ліпеня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклад старшыні Гомельскага аблвыканкама Івана Крупко аб устараненні ў рэгіёне наступстваў урагану, паведамляе БЕЛТА.**

Іван Крупко падрабязна далажыў Прэзідэнту аб ходзе аднаўленчых работ у вобласці і сітуацыі на раніцу чацвярга ў цэлым.

Кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача да раніцы пятніцы завяршыць усе работы па падключэнні насельніцтва да электрасілкавання, у тым ліку ў самых аддаленых населеных пунктах.

«Да раніцы ўсе праблемы, асабліва для насельніцтва, павінны быць зняты», — так гучала даручэнне Прэзідэнта.

Міністэрству энергетыкі і старшыням аблвыканкамаў пастаўлена задача па рэвізіі ўсіх энергетычных магутнасцяў і электрасетак, а таксама наяўнасці ліній рэзервовага сілкавання. У выпадку выяўлення хоць якіх-небудзь невялікіх фактараў, што выклікаюць насцярожанасць, старыя сеткі павінны быць дэманціраваны і заменены, каб пазбегнуць у будучым такіх сітуацый. Гэта яшчэ адно даручэнне Аляксандра Лукашэнкі.

Другі блок даручэнняў датычыўся ўстаранення наступстваў стыхіі ў лясным масіве.

# УРАДЖАЙ НА ПОЛІ. ЯГО ТРЭБА САБРАЦЬ БЕЗ СТРАТ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Пры гэтым, паводле яго слоў, умовы надвор'я ўносяць карэктывы ў працу, часам не дазваляючы атрымліваць неабходную прадукцыйнасць. «Аграрыі гатовыя да ўсіх змен прыродных фактараў. Стаіць задача — максімальна выкарыстоўваць наяўную тэхніку, штодня забяспечваць не менш за 5 % уборкі збожжавых каласавых, рапсу», — дадаў начальнік Галоўнага ўпраўлення раслінаводства Мінсельгасхарча.

Фота БелТА.

Так, на раніцу чацвярга (18 ліпеня) убрана ўжо больш за 21 % збожжавых каласавых і намалочана амаль 1,5 мільёна тон збожжа. Убрана больш за 70 % азімага рапсу і намалочана амаль 700 тысяч тон маслянога насення дадзенай культуры. «Гэтыя лічбы вышэй за паказчыкі аналагічнага перыяду мінулага года. На палях ураджай ёсць. Спадзяемся, што запланаваныя аб'ёмы будуць атрыманыя», — заключыў Мікалай Лешык.

Высокую гатоўнасць тэхнічнай базы ўборачнай кампаніі адзначыў **начальнік Галоўнага ўпраўлення тэхнічнага прагрэсу і энергетыкі, дзяржаўнага нагляду за тэхнічным станам машын і абсталявання Станіслаў КАРПОВІЧ.** Ён заявіў, што ва ўборачнай кампаніі задзейнічана больш за 120 тысяч адзінак тэхнікі, у тым ліку 7,4 тысячы уборачных камбайнаў, больш за 8 тысяч машын для адвозкі збожжа і каля дзвюх тысяч збожжаўборачных комплексаў для дапрацоўкі збожжа. «Адначасова будзе весціся падрыхтоўка машын, якія будуць удзельнічаць у апрацоўцы глебы і восеньскай сяўбе. Гатоўнасць тэхнікі высокая. Забяспечанасць запчасткамі дастатковая для таго, каб падтрымліваць машынна-трактарны парк у тэхнічна спраўным стане. Машыны забяспечаны ўсімі сродкамі пажаратушэння. Усе арганізацыйныя пытанні кантралююцца. Сумесна з органамі дзяржаўнага кіравання, у тым ліку з Міністэрствам прамысловасці і камітэтамі па сельскай гаспадарцы, заводамі — вытворцамі сельгастэхнікі, на рэгулярнай аснове праводзяцца аператыўныя нарады, што дазваляе падтрымліваць тэхніку ў працаздольным стане», — падсумаваў Станіслаў Карповіч.

### Наша тэхніка дазваляе падымаць і палегліцу

Пасля непагадзі ў выхадныя дні, якая нанесла значны ўрон сельскай гаспадарцы ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, аграрыі аднавілі ўборачную кампанію. Прыродныя анамаліі, зарэгістраваныя ў краіне, сталі прычынай значных пашкоджанняў збожжавых пасеваў, пасеваў рапсу і кармавых культур, у першую чаргу кукурузы. Сур'ёзны ўрон нанесены пасевам лёну. Агульная сітуацыя па краіне ацэненая ў 27, 5 тысячы гектараў пашкоджаных плошчаў.

Аднак Мікалай Лешык падкрэсліў, што праца па ацэнцы наступстваў стыхіі працягваецца і ёсць падставы меркаваць (гледзячы на магутныя ліўні ў чацвер), што гэты паказчык зменіцца. Найбольшая колькасць пацярпелых плошчаў была падлічана на поўдні краіны і яе цэнтральнай частцы: звыш васьмі тысяч гектараў пасеваў пашкоджана ў Гомельскай вобласці, больш за 7 тысяч гектар і 6 тысяч гектараў у Брэсцкай і Мінскай абласцях адпаведна. Разам з тым ураджай на асобных участках спецыялісты спадзяюцца выратаваць.

Зараз працягваецца праца камісіі па ацэнцы нанесеных страт, спецыялісты вызначаюць далейшы лёс пасеваў. Калі збожжавыя пашкоджаны, але не знішчаны канчаткова, ураджай са стратамі і ніжэйшай якасцю, але будзе ўбраны, паколькі тэхніка дазваляе падымаць і палегліцу. Сустракаюцца, на жаль, і ўчасткі, дзе каласы выратаваць не атрымаецца, — такія пасевы будуць спісаныя. Палі тут падрыхтуюць да сяўбы наступных сельскагаспадарчых раслін. Што тычыцца кармавых культур, участкі з гушчынёй, якая перавышае 50 % ад першапачаткова высеяных аб'ёмаў, будуць прыбраныя. Лёс іншых вырашаць эксперты: плошчы альбо засеюць прамежкавымі кармавымі раслінамі, альбо падрыхтуюць пад сяўбу азімых ураджаю 2025 года.

Пацярпелыя пасевы не адзіная праблема для аграрыяў. Многія сельскагаспадарчыя аб'екты — фермы, збожжатокі і сушылкі — засталіся без электраэнергіі, што не дазваляе весці актыўную ўборку пераўвільготненых участкаў, бо збожжа з іх неабходна прасушваць. Гэта адбілася на тэмпах уборачных работ, знізіўшы іх на парадак. Важна, акрамя таго, забяспечыць падачу электраэнергіі на жывёлагадоўчыя аб'екты, бо без электрычнасці складана забяспечыць рэгулярнае кармленне і даенне буйной рагатай жывёлы.

Сыравіны для хлеба і макаронных вырабаў у краіне, паводле ацэнак Мінсельгасхарча, павінна хапіць. Для гэтых патрэб на прадпрыемствы перапрацоўкі пастаўляюць 13—15 % сабранага збожжа каласавых.

«Мы ў любым выпадку разумеем, што гэта першачарговая задача. І мільён збожжа будзе пастаўлена ў бягучым годзе на перапрацоўчыя прадпрыемствы. Гэта значыць харчовая бяспека краіны будзе забяспечаная», — адзначыў Мікалай Лешык.

Паводле папярэдніх разлікаў, ураджаю будзе дастаткова, каб забяспечыць і кармамі жывёлагадоўлю. «Якія не былі б падзеі апошніх дзён, у нас яшчэ ёсць пасевы кукурузы, і яны таксама даволі ў добрым стане», — падкрэсліў прадстаўнік міністэрства.

### Праводзяцца комплексныя меры па зніжэнні пажараў

Традыцыйна ў летняй кампаніі адно з асноўных пытанняў, якому надаюць самую сур'ёзную ўвагу — гэта падрыхтоўчы этап да ўборачнай. Такім меркаваннем падзяліўся **начальнік Галоўнага ўпраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь Дзмітрый ТУРЧЫН.**

«Каля шасці з паловай тысяч аб'ектаў намі ўжо абследавана, выдадзены адпаведныя пры наяўнасці парушэнняў рэкамендацыі і прадпісанні па іх ліквідацыі. Вядома ж, усе гэтыя рэйды праводзяцца сумесна, у тым ліку і з органамі ўнутраных спраў, са сродкамі масавай інфармацыі, з органамі ўлады, з тэхнічнымі інспекцыямі. Яны абыходзяцца, вядома ж, не без парушальнікаў. З улікам права адміністрацыйнага заканадаўства, мы ў тым ліку вызваляем ад адказнасці з вынясеннем афіцыйнага папярэджання, але ёсць асобы, да якіх, на жаль, з першага разу не заўсёды атрымліваецца дастукацца. У гэтым выпадку яны прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці. Такіх у цяперашні час 126 кіраўнікоў і іншых службовых асоб», — распавёў Дзмітрый Турчын.

Асноўная прычына ўзгарання гэтай тэхнікі — няспраўнасць у эксплуатацыі электраабсталявання і знос механізмаў. Пажары ўзнікаюць у выніку курэння на працоўным месцы, бескантрольных зварачных работ, а яшчэ таму, што часам гэтая дарагая тэхніка ў вёсках строга не ахоўваецца.

«Прафілактычная работа, якая актыўна намі праводзіцца, дае вынік, што адлюстроўваецца на статыстыцы пажараў, у тым ліку і падчас уборачнай кампаніі, — падкрэсліў Дзмітрый Турчын. — Сёлета ад пажараў выратавана 2 будынкі, 8 адзінак тэхнікі, 8 тон збожжа, 68 тон саломы. У адносінах да мінулага года значна зніжаны аб'ёмы знішчанай або пашкоджанай сельскагаспадарчай маёмасці: па будынках і збудаваннях зніжэнне парадку 16 %, па колькасці грубых кармоў — 89 %, саломы — 87 %, па колькасці пасеваў збожжавых — зніжэнне на 100 %. У 53 % выпадкаў вядучую ролю ва ўзнікненні пажараў адыгрывае чалавечы фактар, калі на вытворчасці не выконваецца тэхналагічны рэгламент».

Таксама Дзмітрый Турчын распавёў, што традыцыйна супрацоўнікі МНС аказваюць актыўную дапамогу ва ўборцы ўраджаю — на розных работах задзейнічана каля 418 чалавек з гэтага ведамства.

**Сяргей КУКАЧ.**

# АЎТАІНСТРУКТАР НА АБЦАСАХ

## Руль у надзейных руках

Вольга ўспамінае таксама начныя паездкі з сяброўкай, якая брала бацькоўскі аўтамабіль, і яны разам каталіся па вёсцы. Вольга аднойчы папрасіла даць паруліць. Сяброўка і навучыла ўсяму. Вольга адразу зразумела, што гэта яе. І калі да гэтага былі думкі падаць дакументы ў мастацкае вучылішча — з адзнакай скончыла мастацкую школу, то пасля таго, як пакарыла жалезнага каня, ні пра што іншае не думала, як толькі пра работу на аўто.

Вучоба прайшла лёгка. Здала ўсё з першага разу. А праз некалькі гадоў прыйшла ў гэтую ж аўташколу працаваць.

— Вакансію знайшла выпадкова. Сядзела дома, гартала газету і трапіла на аб'яву, — расказвае Вольга. — Аўташколе, дзе я вучылася, патрабаваўся майстар вытворчага абучэння. Запісалася да дырэктара на прыём і смела агучыла яму свае планы. Ён спачатку адмахнуўся, маўляў, не жаночая гэта прафесія. Толькі пажартаваў: калі прайду дадатковае навучанне ў Мінску, ён падумае. Але я дзяўчына ўпартая, адразу ж накіравалася ў сталіцу. Калі вярнулася адтуль з запаветнай «корачкай», дырэктар здаўся. З тых пор і працую аўтаінструктарам. Стаж ужо 12 гадоў. Такога пастаянства ніхто з маіх паслядоўніц не прадэманстраваў. Пасля мяне ў аўташколу прыходзілі яшчэ жанчыны, але доўга не вытрымлівалі. Да гэтай прафесіі трэба яшчэ прывыкнуць. Я ж імкнулася паказаць, што жанчыны спраўляюцца з ёй не горш за мужчын, а дзесьці, магчыма, і лепш. Як пацвярджэнне, былі і граматы, і падзякі, у тым ліку і ад ДАІ.

## «Падразалі», а потым ... прасілі прабачэння

У якасці аўтаінструктара Вольга паспрабавала сябе ў трох аўташколах. Зараз яна майстар вытворчага абучэння механічнага транспартнага сродку ў магілёўскай аўташколе «Сігнал». І шмат хто спецыяльна да яе запісваецца на ваджэнне. Арыентуюцца на водгукі ў інтэрнэце. Пры першым знаёмстве некаторыя атрымліваюць лёгкае расчараванне. Ну чаму гэта дамачка са знешнасцю кіназоркі можа навучыць? Але пачнеш з ёй размаўляць і разумееш, што перад табой не легкадумная дзяўчына, а асоба з моцным характарам. Без упартасці і цвёрдасці наогул у гэтай прафесіі нічога не атрымаецца. За 20 заняткаў навучыць чалавека, які за рулём ніколі не сядзеў, ваджэнню — не простая задача. Асабліва ў горадзе, дзе вялікі рух і кіроўцы, на жаль, не ўсе дысцыплінаваныя.

Адзін раз у вучэбнае аўто ззаду ўляцела машына. На шчасце, траўмы былі нязначныя. А нядаўна іх аўто жорстка падрэзаў БМВ. Нахабнікаў, на жаль, хапае. Але хутка крыўдзіцель знайшоўся. Праз два дні Вользе пазваніў знаёмы інструктар і паведаміў, што той чалавек, які «падрэзаў» «вучэбку», просіць прабачэння. Ён свядома парушыў правілы, каб самому пазбегнуць аварыі, і запомніў нумары, каб потым выбачыцца. Быў вельмі ўражаны, калі даведаўся, што інструктарам аказалася жанчына.

— А яшчэ быў выпадак на кальцавым перакрыжаванні, калі ліхач «падрэзаў» вучэбнае аўто, ды яшчэ і курсантку зняважыў, — расказвае Вольга. — Сказаў, што яна правілы парушае. Насамрэч, парушыў ён. Проста не ведаў пра апошнія змяненні ў ПДР. Дзяўчына ж вельмі засмуцілася. Але я сваіх у крыўду не даю. Патэлефанавала ў ДАІ, патлумачыла ў чым справа, на наступны дзень гэты чалавек патэлефанаваў і папрасіў прабачэння. Сказаў, што прыйдзе на пераабучэнне. І курсантцы патэлефанаваў, сказаў, што пагарачыўся.

Вольга сярод сваіх курсантаў аўтарытэт. Прызнаецца, што яе вельмі засмучае, калі ў кагосьці не атрымліваецца, стараецца дапамагчы, падбадзёрыць. Перажывае, калі дзяўчаты плачуць з-за няўдач або рэзкасці іншых інструктараў. Безаглядна кідаецца абараняць курсантак. Вельмі хвалюецца, калі яе падапечныя здаюць экзамен ў ДАІ. Калі няма магчымасці падтрымаць чалавека на месцы, тэлефануе і цікавіцца, як справы. Нехта ёй аднойчы расказваў, як разгубіўся падчас экзаменацыйных іспытаў, не ведаў, што рабіць, і раптоўна пачуў за спіной яе голас. У выніку прыйшла ўпэўненасць, і экзамен быў здадзены.

— Пры выездзе нашага вучэбнага аўто ў горад заўсёды малюся: «Дай Бог, каб сёння было ўсё добра!», — кажа Вольга. — Работа аўтаінструктара небяспечная. Адсочваеш усё, што адбываецца на дарозе, ці ідуць там пешаходы, што робіцца ззаду, якія рухі выконвае курсант, ці тую педаль выціснуў, ці тую перадачу ўключыў. Трэба паказаць, патлумачыць. Бывае, вечарам прыходзіш дамоў выціснуты як лімон і думаеш: трэба мяняць прафесію. І так 12 гадоў. А раніцай усё пачынаеш ізноў. Бяжыш на работу і разумееш, што гэта тваё. Яна падабаецца мне за стасункі з рознымі людзьмі. За тыя шчаслівыя эмоцыі, калі курсанты атрымліваюць правы і радуюцца. Адчуваеш, што і ты да гэтага маеш дачыненне.

## «Было не па сабе, і я пела»

Багатым на прыгоды быў перыяд, калі Вольга працавала адначасова на трох работах — днём у аўташколе, вечарам на таксі, у выхадныя на міжгародніх перавозках. Пяць гадоў яна курсіравала на пасажырскай маршрутцы паміж Магілёвам і Бабруйскам. У 2016 годзе ўбачыць жанчыну за рулём аўтобуса было яшчэ дзіўна. Пасажыры вельмі бурна на гэта рэагавалі. Некаторыя адпраўляліся з ёй у дарогу з пачуццём страху, а потым перадавалі цераз дыспетчара падзякі за вельмі камфортную паездку.

Аднойчы ў маршрутцы ехалі на нейкае свята два мужчыны з цюльпанамі. Убачылі, што жанчына за рулём, сталі гэта бурна каментаваць, а калі высаджваліся, тыя кветкі Вользе падарылі. Іншы раз пасажырка папрасіла Вольгу сфатаграфаваць з ёй на памяць, сказала, што ёй не паверацца, калі яна раскажа, што яе везла жанчына. І папрасіла аўтограф.

Здараліся і экстрэмальныя паездкі. Аднойчы пры абгоне фуры, калі машына ўжо вярталася ў сваю паласу, яе стала «штарміць» — лопнула задняя кола. Бабруйская траса вузкая, страшна падумаць, што магло б стаць з маршруткай, поўнай пасажыраў, калі б сітуацыя выйшла з-пад кантролю. Вольга хутка ацаніла, што ззаду ідзе фура і тармазіць трэба вельмі акуратна. У яе атрымалася ўтаймаваць машыну і плаўна спыніць яе на абочыне. Пасажыры нават не зразумелі, што адбылося. Толькі, калі ўбачылі, ва што пераўтварылася задняя кола, зніякавелі.

— Я ж папярэдзіла аператара і пайшла мяняць кола, — успамінае той эпізод Вольга. — Уявіце сабе, з кабіны вадзіцеля выйшла дзіва ў сукенцы, мадэльных ботах — я тады наогул абутак без абцасаў не насіла, — і пайшла за дамкратам. Запаснае кола было пад днішчам машыны, мужчына з ліку пасажыраў дапамог яго дастаць. Памянялі і паспелі своечасова прыехаць у Бабруйск. Нават не спатрэбілася іншую маршрутку выклікаць.

Наступны выпадак ўжо з яе практыкі работы на таксі. Аднойчы Вольга паехала выконваць заказ, які паступіў з раёна. Калі ўбачыла кампанію п'яных мужыкоў, напружылася. Разумела, што трэба нешта прыдумаць, каб абстаноўка не выйшла з-пад кантролю. Уключыла рэтра-песні і пачала пець, пасажыры падхапілі. Пелі ўсе 30 кіламетраў да Магілёва. Калі сімпатычная таксістка высаджвала кампанію, усе цёпла з ёй развіталіся і працягвалі пець.

## І крышачку — псіхолаг

Звычка не гуляць кантроль у экстрэмальнай сітуацыі — прыслухоўвацца да сябе, разважаць і не панікаваць — у яе з дзяцінства. Тады з ёй здарыўся павучальны выпадак, які ледзь не абярнуўся трагедыяй. Вольга з аднагодкай пабегла купацца на возера Вільчанка. Сама яна плаваць умела, а вось сяброўка не. Апошняя ўхапілася за бервяно, якое плавала непадалёк, і паплыла за вопытнай напарніцай. Дзяўчаты былі ўжо далёка ад берага, калі сяброўка вырашыла залезці на бервяно. Яно выслізнула, і небарака яго ўпусціла. Сама ў паніцы пайшла на дно. Вольга нырнула, выцягнула сяброўку на паверхню, тая паветра глытнула і зноў схавалася пад вадой. Дзяўчынка стала панікаваць, але Вольга яе змагла супакоіць: «Не бойся, я цябе не кіну!». Ледзь угаварыла легчы на спіну, і так-сяк даплылі да берага. Там стаялі два дарослыя мужыкі і ўсміхаліся. Калі Вольга абурылася, што яны нават не паспрабавалі дапамагчы, толькі паціснулі плячыма: «Мы думалі, вы жартуеце».

— Тая сітуацыя была страшнай, — прызнаецца суразмоўніца. — Шмат разоў пракручвала яе ў галаве. А што было б, калі б я таксама запанікавала? Паплыла б, напрыклад, за тым бервяном? Пакуль ратавала сяброўку, сама наглыталася вады так, што ў грудзях пякло...

Вольга тонка адчувае людзей, і лічыць, што гэтаму яе навучыла прафесія:

— Кожны раз працуеш з новымі людзьмі. Пачынаеш размаўляць і разумееш, да каго які падыход павінен быць. Кагосьці трэба супакоіць, кагосьці падбадзёрыць.

Вольгу цяжка ўявіць са слязамі на вачах. Але яна прызнаецца, што бываюць хвіліны, калі яна плача. На людзях жа — выключна слёзы радасці.

— У адной вучаніцы ніяк не атрымлівалася кіраваць, і раптоўна ўсё атрымалася, — расказвае Вольга. — Яна заплакала, і я следам за ёй. Гэта былі слёзы радасці. Мая задача знайсці падыход, каб чалавек раскрыўся і навучыўся. Бываюць вучні абыякавыя, яны атрымаюць правы, але не ездзяць. А ёсць, якія цяжка вучацца, але потым ездзяць добра. Калі ёсць мэта, яе трэба дабівацца, не кідаць справу на паўдарогі. Мары павінны здзяйсняцца.

## Заставацца жанчынай

Вольга Кашанкова асоба эфектная — макіяж, адзенне, абцасы. Курсантаў, асабліва жаночага полу, гэта крыху збівае з толку. Пры словазлучэнні жанчына-інструктар уяўляеш сабе іншы вобраз.

— Калі працуеш у мужчынскім калектыве, трэба абавязкова падкрэсліваць сваю жаноцкасць, — лічыць яна. — Таму прачынацца раніцай стараюся з запасам. Не дазваляю сабе расслабляцца. З узростам раблюся больш спакайнейшай. Менш крыўдую. Разумею, што сапраўды злых людзей мала. Сама адходлівая, але прынцыповая. Калі мне здраджваюць, адпускаю, але больш з такім чалавека не збліжаюся. Бог яму суддзя. Нядаўна ў краме назірала такую карціну: стаіць жанчына сярэдняга ўзросту, побач малады чалавек з адкрытай бутэлькай гарэлкі і міліцыя. Зразумела, што скраў. Выбіраю таматы і лаўлю на сабе позірк той жанчыны, такі жаласны і просячы. Я паклала тыя таматы, падышла і спыталася, ці магу чымсьці дапамагчы. Міліцыянер сказаў: ужо не, складзены пратакол. А мне было шкада і жанчыну, і яе сына. У жыцці розныя сітуацыі бываюць. Мы павінны дапамагаць адзін аднаму, не адварочвацца, калі камусьці дрэнна, заставацца людзьмі. Бо як ты да другіх ставішся, так і Бог да цябе. Гэта ўжо праверaная ісціна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Вольгі КАШАНКОВАЙ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Еўрапейскія палітыкі апасаюцца за сваё жыццё

Замах на экс-прэзідэнта ЗША Дональда Трампа падчас перадвыбарчага мітынгу ўсяліў у еўрапейскіх палітыкаў страх, што яны таксама могуць падвергнуцца нападу. З такой ацэнкай выступіла еўрапейскае выданне Politico. На думку газеты, падзея, што адбылася, стала для еўрапейскіх палітыкаў напамінам аб тым, што небяспека палітычнага гвалту ў Еўропе таксама расце. На гэтым фоне лідар парламенцкай фракцыі французскай партыі «Нацыянальнае аб'яднанне» Марын Ле Пэн, каментуючы замах на Трампа, папярэдзіла, што «Францыя не застрахавана ад такога гвалту». Як адзначае выданне, асцярогі еўрапейскіх эліт узмацняе і той факт, што падобнае ўжо здаралася ў Еўропе. У маі адбыўся замах на славацкага прэм'ер-міністра Роберта Фіца, у мінулым месяцы нападзенне пяражыла кіраўнік дацкага ўрада Мэтэ Фрэдэрыксен, а ў Вялікабрытаніі за апошнія восем гадоў забілі двух членаў парламента.

## У Вялікабрытаніі арганізацыю нелегальнай міграцыі прыраўняюць да тэрарызму

Пра гэта сказаў кароль Злучанага Каралеўства Карл III у троннай прамове з нагоды адкрыцця першай сесіі новага складу брытанскага парламента, на якой былі агучаныя галоўныя прыярытэты ўрада Лейбарысцкай партыі, паведаміла ТАСС. Карл III адзначыў, што «ўрад будзе імкнуцца ўзмацніць граніцы». Паводле яго слоў, будзе прадстаўлены дакумент аб «мадэрнізацыі іміграцыйнай сістэмы і сістэмы атрымання прытулку», а таксама аб «стварэнні новага камандавання па забеспячэнні бяспекі граніц і даванні дадатковых контртэрарыстычных паўнамоцтваў для барацьбы з арганізаванай злачыннасцю ў сферы іміграцыі». Троннае выступленне караля Злучанага Каралеўства традыцыйна рыхтуецца ўрадам. Сёлета яно складалася з больш чым 30 заканадаўчых ініцыятыў Кабінета міністраў лейбарыстаў, якія прыйшлі да ўлады ўпершыню за 14 гадоў па выніках парламенцкіх выбараў 4 ліпеня.

## На Месяцы знайшлі пячору, здольную абараніць людзей ад суровых умоў

Аб гэтым паведаміла РІА «Новости» са спасылкай на часопіс Nature. Аўтарамі даследавання выступіла група вучоных з ЗША і Італіі. Аналіз даных, сабраных месяцавым разведвальным арбітальным зондам НАСА (LRO), паказаў, што Мора Спакою, якое з'яўляецца самай глыбокай на Месяцы вядомай западзінай, вядзе да пячоры шырынёй каля 45 метраў і даўжынёй каля 77 м. Пячора знаходзіцца прыкладна ў 150 метрах пад паверхняй. Паводле даных даследавання, далейшая непасрэдная разведка пячоры магла б пацвердзіць наяўнасць стабільнай падземнай абароны ад радыяцыйнага асяроддзя з аптымальнымі тэмпературнымі ўмовамі для будучага выкарыстання чалавекам. Акрамя таго, у даследаванні паведамляецца, што на розных шыротах Месяца было выяўлена больш за 200 ям.

Сядзі і глядзі

# НОВЫЯ СУСТРЭЧЫ З ЛЮБІМЫМІ...

**На сацыякультурным тэлеканале ў бліжэйшыя выхадныя і на наступным тыдні будзем зноў згадваць вялікіх артыстаў, кінатворцаў і зможам перагледзець іх працы.**

Напрыклад, 20 і 21 ліпеня запланаваны паказ мастацкага фільма «Карнавал» (СССР, 1981 г.), рэжысёрам якога з'яўляецца Таццяна Ліознава. Кінематаграфічны свет сёлета адзначае 100 гадоў з дня яе нараджэння (1924–2011 гг.). Дарэчы, прыхільнікаў творчасці Таццяны Ліознавай таксама парадуюць і на тэлеканале «Расія-Культура», дзе ў суботу днём пакажуць дакументальны фільм пра яе «Дажыць да светлай паласы». Яе кінастужкі «Тры таполі на Плюшчысе», «Памяць сэрца», «Еўдакія», «Карнавал» знайшлі вялікі водгук у гледачоў, а тэлесерыял «Сямнаццаць імгненняў вясны» стаў на доўгія гады культавым. А пра тое, як яны ствараліся, дзе ў іх хаваюцца ноткі асобы рэжысёра, чаму не губляецца магія гэтых фільмаў праз гады — даведаемся ад самой Таццяны Міхайлаўны і яе калег. Калі цікава, то паглядзіце ў 14.30. А пасля запланаваны паказ драмы «Ім скараецца неба» (1963 г.).

Таццяна Ліознава зняла не толькі культавы серыял пра Шчірліца, але і не менш культавы фільм «Карнавал».

